# ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

УДК 378.4:[008+7](476.25)+929:37(476) Марэцкі А. І.

## Чалавек вялікай душы: настаўнік, вучоны, педагог. Да 80-годдзя Антона Іванавіча Марэцкага

Споўнілася 80 гадоў аднаму са старэйшых выкладчыкаў нашага ўніверсітэта, які быў сярод пачынальнікаў яго гісторыі Антону Іванавічу Марэцкаму. Паважаны ў нашым калектыве чалавек падыйшоў да юбілею з багатым багажом добрых спраў, з гонарам выконваючы свае абавязкі.



Выпускнік Мінскага педагагічнага інстытута, 1964

Нарадзіўся А. І. Марэцкі 13 чэрвеня 1936 г. у адным з маляўнічых куткоў Беларусі, што ляжыць на скрыжаванні гістарычных і геаграфічных шляхоў у вёсцы Андрыеўшчына Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Бацька – Іван Іосіфавіч працаваў аглядчыкам вагонаў на чыгунцы, а маці – Яніна Іванаўна, як і большасць вясковых жанчын таго часу, працавала ў калгасе.

Нягледзячы на складанасці пасляваеннага часу, моладзь імкнулася да вучобы. Таму, скончыўшы ў 1951 г. Паланевіцкую сямігадовую школу, юнак паступіў у 8 клас 74-й чыгуначнай школы г. Рослаўля Смаленскай вобласці, якую скончыў у 1954 г.



Служба ва Узброеных Сілах СССР у Закаўказскай ваеннай акрузе 1956–1959 гг. Каля сцяга в/ч 54002

У тым жа годзе Антон Іванавіч быў залічаны навучэнцам Мінскага педагагічнага вучылішча імя Н. К. Крупскай. Два гады вучобы прайшлі хутка, але сяброўства з таварышамі-навучэнцамі засталося на ўсё жыццё. Так, з адным з іх, Пятром Рыгоравічам Ігнатовічам лёс звёў на доўгія гады ў нашым універсітэце.

Неўзабаве надышоў час выконваць канстытуцыйны абавязак – абараняць Радзіму, і ў ліпені 1956 г. адбыўся прызыў на тэрміновую ва-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

енную службу ва Узброеныя Сілы СССР. Аднак і тут спатрэбіліся ўменні хлопца з беларускай вёскі працаваць на зямлі, таму з ліпеня па снежань выпала браць удзел ва ўборцы ўраджаю на распаханых цалінных землях у Какшэтаўскай вобласці Казахстана. А служыць давялося ў Закаўказскай ваеннай акрузе.

Аднак хацелася набыць вышэйшую адукацыю. Таму з 1959 г. па 1964 г. Антон Іванавіч навучаўся на гісторыка-геаграфічным факультэце Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Таленавіты студэнт адразу заявіў аб сабе, і ўжо з 2 курса атрымліваў Ленінскую стыпендыю, а закончыў вучобу з чырвоным дыпломам.

Прымяненне набытых ведаў і засваенне педагагічнага майстэрства адбылося ў якасці выкладчыка Аршанскага чыгуначнага тэхнікума, працаваць у якім давялося з 1964 г. па 1966 г.

Цяга да навукі, асабісты інтарэс, прызванне акрэслілі напрамак далейшага інтэлектуальнага ўдасканалення жыццёвага выбару – філасофія. У 1966 г. кафедра філасофіі МДПІ набывае годнага аспіранта, які паспяхова здаў уступныя экзамены, паказаўшы выдатныя веды. А калі ў 1969 г. навучанне ў аспірантуры было скончана, перспектыўны навуковец, які меў змястоўны вопыт выкладчыцкай працы, быў пакінуты на рабоце на той жа кафедры на пасадзе выкладчыка. Паспяховая праца дазволіла хутка стаць старшым выкладчыкам. У 1972 г. Антон Іванавіч абараніў кандыдацкую дысертацыю ў інстытуце філасофіі Акадэміі навук БССР, у сектары, якім кіраваў знакаміты вучоны, акадэмік К. П. Буслаў. У 1977 г. А. І. Марэцкаму было прысвоена званне дацэнта. Працуючы на кафедры філасофіі ў 1972 г. Антон Іванавіч быў прызначаны намеснікам дэкана факультэта бібліятэказнаўства і бібліяграфіі. На гэтай пасадзе ён працаваў тры гады.

У 1975 г. быў адкрыты Мінскі інстытут культуры, і з гэтай пары жыццёвы шлях А. І. Марэцкага непарыўна з ім звязаны. Тут ён прайшоў шлях ад старшага выкладчыка да прафесара. Прыйшоўшы на працу на кафедру філасофіі і палітэканоміі, якая вытрымала затым розныя мадыфікацыі і перытрусы, ён працуе на ёй да гэтай пары.

Кіраўніцтва ўніверсітэта ўлічыла педагагічны, навуковы і арганізатарскі вопыт стараннага выкладчыка, і ў тым жа 1975 г. яму была даверана пасада дэкана факультэта завочнага навучання. На гэтай пасадзе Антон Іванавіч працаваў 38 гадоў. Яго вучнямі былі многія выдатныя дзеячы беларускай культуры, якія атрымалі тут вышэйшую адукацыю і засталіся ўдзячнымі педагогу-кіраўніку за клопаты і ўвагу да іх.

Аднак не толькі адміністрацыйная і выкладчыцкая праца займалі дзейнасць прафесара, ён вядомы і як навуковец. Яго навуковы інтарэс – праблемы патрыятызму і інтэрнацыяналізму, нацыянальных адносін і ўзаемадзеяння нацый. Няма патрэбы гаварыць, наколькі гэта сёння ак-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туальна. Шмат увагі надаецца праблемам адукацыі і выхавання студэнтаў, якія набываюць вышэйшую адукацыю без адрыву ад вытворчасці.

Вынікі плённай працы педагога ўражваюць. Сярод яго выхаванцаў шмат дастойных людзей, якія працуюць на ўсіх узроўнях сістэмы культуры. Сярод іх кіраўнікі Міністэрства культуры, абласных і раённых аддзелаў культуры, вядомыя дзеячы ўстаноў мастацтва і артысты. Усім вядомыя імёны Н. П. Аўдзеевай – старшыні Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, С. Р. Сарокі – дырэктара Маладзечненскага Палаца культуры, заслужаных артыстаў Рэспублікі Беларусь У. Г. Радзівілава (галоўнага Дзеда Мароза краіны), А. А. Рамашкевіч, В. П. Шчырыцы і многіх іншых.

Шматгранная дзейнасць А. І. Марэцкага, непарыўна звязаная з педагагічнай, здабыла павагу і вядомасць у розных навучальных і грамадскіх установах. Так, ён больш за 25 гадоў быў адказным сакратаром прыёмнай камісіі: спачатку ў МДПІ, а затым у нашым БДУКМ. 20 гадоў з'яўляўся старшынёй участковай выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў, пачынаючы з мясцовых Саветаў і да выбараў у Вярхоўны Савет СССР. Адначасова з'яўляўся членам камісіі па ўручэнні штогадовых (прэмій) намінацый у галіне культуры Мінскай вобласці.

Плённая праца Антона Іванавіча Марэцкага не засталася па-за ўвагай грамадскасці, роднага калектыву. Ён быў узнагароджаны знакам «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, многімі ганаровымі граматамі: Вярхоўнага Савета БССР, Міністэрстваў адукацыі СССР і БССР, рэктаратаў Мінскага педагагічнага інстытута і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Рэктарат, супрацоўнікі кафедры філасофіі, калегі па працы шчыра віншуюць Антона Іванавіча Марэцкага з юбілеем і жадаюць яму і далей крочыць па жыцці з пачуццём адказнасці перад грамадствам, родным калектывам, жыццёвых даброт і моцнага здароўя.

**У. Ф. Красюк,**
кандыдат філасофскіх навук,
дацэнт, дацэнт кафедры філасофіі Беларускага
дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнцкія гады ў сценах
Мінскага дзяржаўнага
педагагічнага інстытута
имя А. М. Горкага

Сустрэча студэнтаў
з М. Танкам, 1962



Кафедра філасофіі,
1977



Рэктарат.
30-годдзе ўніверсітэта

Фота Ю. Іванова



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ